Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

11 КРАСАВІКА 2017 г. АЎТОРАК № 68 (28432)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



### Як правільна прымаць лазню?

СТАР. 5



### Пашпарт для бульбы

СТАР. 11



### Спыніць хвалю тэрарызму

СТАР. 13

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір ГУСАКОЎ, старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук:**

*«Апошнім часам істотна павысілася акупнасць нашых навуковых даследаванняў. Так, аб'ём выручкі ад рэалізацыі створанай па праграме прадукцыі ў адносінах да аб'ёму выдаткаваных бюджэтных сродкаў дасягае ў цяперашні час больш за BYN100 на BYN1. Яшчэ некалькі гадоў таму было BYN20 і менш. Распрацоўкі беларускіх вучоных прадаюцца больш чым у 60 дзяржавах. Наладжваюць актыўнае ўзаемадзеянне і з новымі партнёрамі».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.04.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9027 | ▲ |
| Еўра | 2,0134 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0331 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0706 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# УГЛЯДАЮЧЫСЯ Ў ВЯСНУ...



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Выкладчыца экалагічнага права ў Брэсцкім філіяле БДУ Марыя САМУСЕВІЧ.**

■ Падрабязнасці

## Жыллё ў арэнду. Фінансавую

### Усе нюансы набыцця кватэры ў лізінг

**Цяпер у краіне сфарміраваны ўсе прававыя ўмовы для выдачы фізічным асобам у валоданне і карыстанне жылых дамоў і кватэр па дагаворах фінансавай арэнды (лізінгу). Адпаведны ўказ быў падпісаны кіраўніком дзяржавы на мінулым тыдні.**

Трэба заўважыць, што сістэма лізінгу жылля фактычна існуе ў Беларусі ўжо на працягу двух гадоў. За мінулы год у лізінг афармлена больш за 50 кватэр, і ўсё ў адной кампаніі — «АСБ Лізінг», якая дзейнічае ў структуры Беларусбанка. Аднак у старой рэдакцыі прававых умоў лізінгу існавала некалькі спрэчных пытанняў, якія тармазілі масавае выкарыстанне насельніцтвам гэтай сістэмы. Напрыклад, жыхары кватэры, якія карысталіся такім жыллём па дагаворы лізінгу, павінны былі аплачваць жыллёва-камунальныя паслугі па тарыфах для юрыдычных асоб, бо нерухомасць да поўнага разліку за яе знаходзіцца ва ўласнасці лізінгавай кампаніі. А камуналка для юрасоб даволі дарагая.

Як паведаміў на брыфінгу ў прэс-цэнтры БЕЛТА **начальнік упраўлення рэгулявання нябанкаўскіх аперацый Нацыянальнага банка Дзмітрый НАБЗДОРАЎ**, у прынятым дакуменце да карыстальнікаў жылля па лізінгу прымяняюцца тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі, устаноўленыя для насельніцтва.

### Пакуль не разлічыўся — не тваё

У чым розніца паміж лізінгам і купляй кватэры ў крэдыт? Калі вы купляеце кватэру ў крэдыт, яна — адразу ваша, хоць і ў закладзе ў банка. Калі берацё ў лізінг, то нерухомасць належыць лізінгадаўцу да самага апошняга плацяжу.

Дзмітрый Набздораў паведаміў, што ва ўказе №109 не прапісаны мінімальны і максімальны тэрмін такога лізінгу. Зразумела, што ён не можа быць меншы за год — інакш гэта не фінансавы лізінг. Але меж па максімальным тэрміне няма, таму кожная камерцыйная кампанія вызначыць іх для сябе самастойна. Прадстаўнік Нацбанка адзначыў, што цяпер на практыцы дагаворы могуць быць прапанаваны з тэрмінам ад 10 да 25 гадоў.

СТАР. 3

■ Рынак працы

## ІНІЦЫЯТЫЎНАСЦЬ, ГНУТКАСЦЬ, МАБІЛЬНАСЦЬ

### Якімі кампетэнцыямі павінны валодаць маладыя спецыялісты?

**У Аркадзя Райкіна была некалі вельмі папулярная мініяцюра. Артыст прыходзіць да дырэктара атэлье і спрабуе высветліць, хто пашыў яму крывы касцюм. «— Мы! — Хто гэта «мы»? — У нас вузкая спецыялізацыя. Адзін прышывае кішэню, адзін — пройму, я асабіста прышываю гузікі. Да гузікаў прэтэнзіі ёсць?» Да гузікаў прэтэнзій няма, але касцюм — крывы!!!**

**Гэту гісторыю прыгадаў, выступаючы на жнівеньскай педагагічнай канферэнцыі, старшыня Мінгарвыканкама Андрэй Шорац. «Нам сёння трэба «вучыць не таго, каго ўмеем, а таго, хто патрэбны, — падкрэсліў ён. — Дырэктар МТЗ расказаў, што ўвёў сістэму прыёму выпускнікоў вышэйшых навучальных устаноў з патрабаваннем наяўнасці сярэдняга бала не ніжэйшага за «8». Да яго прыйшлі 11 чалавек, больш іх проста няма. Гэта сведчыць аб тым, што мы не падрыхтавалі, не выхавалі, не вывучылі добрага інжынера, маркетолага, эканаміста... Калі маладыя спецыялісты прыходзяць на вытворчасць пасля заканчэння навучальнай установы, першае, што яны чуюць, — параду «забудзьцеся ўсё, чаму вас вучылі». Але чамусьці нікога не засмучае гэта акалічнасць...»**

### Назад у мінулае?

Каго сёння трэба рыхтаваць для рынку працы і якімі кампетэнцыямі павінны валодаць на выхадзе з установы адукацыі выпускнікі, каб быць запатрабаванымі наймальнікамі, — адказы на гэтыя пытанні сёння шукаюць не толькі ў нашай краіне. У лістападзе мінулага года ў Політэхнічным універсітэце г. Валенсія (Іспанія) быў дадзены старт новаму міжнароднаму праекту FOSTERC у рамках праграмы Эразмус +. Праект рэалізуецца кансорцыумам у складзе 15 партнёраў з Іспаніі, Літвы, Польшчы, Фінляндыі і Беларусі.

СТАР. 4